што дамінавалі ў XX стагоддзі. Пры ўсіх тэхналагічных і псіхалагічных інавацыях ён захоўвае сваю ролю творцы сучаснай міфалогіі.

---

[1] *Бодрийяр Жан.* Система вещей. М., 1987. С. 67.

[2] Цыт. па: *Ямпольский М.* Кино как социальный фактор и явление культуры. // Из истории французской киномысли. М., 1988. С. 18.

[3] Цыт па: Edited by Peter Brooker and Will Brooker. Postmodern After-images. A reader in film, television and video. JW Arrowsmith Ltd. Bristol, 1997. P. 1—2.

[4] Таксама.

[5] Цыт па: Douglas Kellner. Media culture cultural studies, identity and politics between the modern and postmodern. Great Britain. Biddles Ltd. Guil Ford and King's Lynn, 1998. P. 43.

[6] Цыт. па: *Ямпольский М.* Память Тиресия. Ad Marginem. М., 1993. С. 57.

[7] *Лиотар. Ж. Ф.* Ответ на вопрос: что такое постмодерн? // Ежегодник. Ad Marginem, М., 1994.

[8] *Гончаренко Ольга.* Психологические аспекты рецепции кино. // Киноведческие записки. 1998. № 40. С. 282.

[9] *Петрищева Мария.* Сьюзен Зонтаг: "Вместо герменевтики нам нужна эротика искусства" // Киноведческие записки. 1998. № 40. С. 295.

***П. М. Епіхаў*** *(Мінск),*
*аспірант Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры*

# РОЛЯ ЭТНАЛОГІІ Ў ВЫХАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА

Адным з важнейшых аспектаў жыццядзейнасці грамадства з'яўляецца адукацыя. Яна адыгрывае важную ролю ў выхаванні, фарміраванні светапогляду людзей, садзейнічае развіццю матэрыяльнай і духоўнай культуры. У сучаснай сістэме адукацыі ёсць уласныя праблемы, адной з якіх з'яўляецца гуманітарызацыя адукацыі. Асабліва востра гэта праблема стаіць у тэхнічных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, дзе да пэўнага часу асноўная ўвага надавалася вывучэнню прыродазнаўчых, тэхнічных і спецыяльных навук. У працэсе складання вучэбнага плана вывучэнню гуманітарных дысцыплін адводзілася мінімальная колькасць часу. Ствааралася такая сітуацыя, калі выпускнік той ці іншай навучальнай установы паспяхова засвойваў сваю спецыяльнасць, станавіўся неблагім спецыялістам у пэўнай сферы ведаў і навукі, але амаль зусім не ведаў гісторыі сваёй краіны, яе найбольш выдатных прадстаўнікоў у галіне гісторыі, культуры, літаратуры, мовы.

У апошнія гады на гэту праблему звяртаецца асаблівая ўвага, прымаюцца пэўныя захады па яе вырашэнні. Зараз у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах уведзены абавязковыя курсы па сусветнай мастацкай культуры, беларускай мове і літаратуры, гісторыі Беларусі. У вучэбным плане тэхнічных навучальных установаў павялічылася ўдзельная вага гуманітарных дысцыплін: сусветная гісторыя, гісторыя Беларусі, гісторыя беларускай літаратуры, гісторыя беларускага мастацтва, этналогія Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі і інш. З'явіліся школы з паглыбленым вывучэннем гісторыі Беларусі, беларускай мовы і літаратуры, павялічваецца колькасць школ і класаў з беларускай мовай навучання. У 1987 годзе на Беларусі меў месца рух за адкрыццё беларускіх класаў у рускіх школах. У 1987/88 навучальным годзе з'явіліся тры такія класы, а ў 1990/91 навучальным годзе іх было ўжо 843, у тым ліку ў Мінску 163[1]. У 1989 годзе 18,3 % карэнных беларусаў лічылі, што выкладанне ў школе, ПТВ, тэхнікуме, ВНУ павінна весціся на беларускай мове. Па даных 1999 года на беларускай мове размаўляюць дома 41 % беларусаў (у сельскай мясцовасці — 79 %, у гарадскіх населеных пунктах — 23 %)[2]. З 1990/91 навучальнага года ў вучэбныя планы ПТВ была ўведзена беларуская мова як абавязковы прадмет. Паступова змяншалася колькасць школьнікаў, якія не вывучалі беларускую мову. Пры паступленні ў любую навучальную ўстанову абавязковымі ўступнымі экзаменамі з'яўляюцца экзамены па беларускай мове і літаратуры, а таксама па гісторыі Беларусі.

Праблема гуманітарызацыі адукацыі цесна звязана з праблемай гуманізацыі грамадства. У сваю чаргу, вырашэнне праблемы гуманітарызацыі адукацыі пэўным чынам вырашае праблему гуманізацыі грамадства. На занятках па гуманітарных дысцыплінах фарміруецца сацыяльна значная і гуманістычная сістэма каштоўнасцей, фарміруюцца адносіны да творчасці як да каштоўнасці. У той час, як дакладныя навукі дапускаюць адно правільнае рашэнне, гуманітарныя навукі — некалькі правільных рашэнняў. Адной з гуманітарных навук, якая займае важнае месца ў сістэме адукацыі і адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці, з'яўляецца этналогія.

У другой палове XX стагоддзя ўзрасла грамадская цікавасць да этналогіі і яе праблем — тэарэтычных і канкрэтных, звязаных з асобнымі этнасамі, краінамі, рэгіёнамі. *Этналогія* — грамадская навука, якая вывучае народы, этнасы і іншыя этнічныя супольнасці, іх этнагенез, побыт, культурна-гістарычныя сувязі. Этналогія як спецыялізаваная галіна гістарычнай навукі вывучае этнасы-народы, іх культуру і побыт ад старажытных часоў да нашых дзён. Асноўная ўвага надаецца вывучэнню спецыфічных асаблівасцей этнічнай культуры і побыту, а таксама рыс, агульных з іншымі этнасамі. Адначасова з аналізам агульнага і спецыфічнага, этналагічная навука разглядае адзінкавае, паасобнае, на базе якога пазнаецца асаблівае, характэрнае для данага этнасу, а таксама агульнае, што аб'ядноўвае гэты этнас з іншымі. Назва "этналогія" з'яўляецца адной з назваў этнаграфіі як навукі. Ужываецца пераважна ў замежнай навуковай літаратуры ў значэнні тэарэтычнай этнаграфіі. У заходнееўрапейскай навуцы тэрмін "этналогія" як тэарэтычная этнаграфія проціпастаўляецца апісальнай этнаграфіі. Ва ўсходнееўрапейскай навуцы тэрмін "этналогія" выкарыстоўваецца "у якасці сіноніма этнаграфіі як адзінай навукі — тэарэтычнай і апісальнай"[3].

Цэнтральным паняццем этналогіі з'яўляецца паняцце этнасу. *Этнас* — гэта ўстойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, рыс псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання. Галоўныя этнічныя прыкметы этнасу (мова, самасвядомасць, культура, побыт, псіхіка і інш.) змяняюцца з цягам часу не так істотна, як сацыяльна-эканамічныя адносіны, якія адпавядаюць пэў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

най гістарычнай ступені развіцця (першабытнае, рабаўладальніцкае, феадальнае, капіталістычнае грамадствы). Этнас характарызуецца "адзінствам тэрыторыі, цэласнасцю і кампактнасцю рассялення насельніцтва, агульнымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі адносінамі, адзінствам асноўных этнічных прыкмет"[4]. З паняццем "этнас" цесна звязана паняцце "этнічнасць". Этнічнасць — гэта "якасць, уласцівая любой этнічнай адзінцы (этнічная супольнасць, этнічная прыкмета), якая характарызуе ступень выяўленасці этнічнай спецыфікі"[5].

З паняццем "этнічнасць", у сваю чаргу, мае цесную сувязь тэрмін "*этнацэнтрызм*". Этнацэнтрызм уяўляе сабой якасна новую ступень развіцця самасвядомасці. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што людзі, якія належаць да пэўнай этнічнай групы, ставяць яе ў культурным і маральным плане вышэй за іншыя групы. Увогуле, можна сказаць, што этнацэнтрызм — гэта "пачуцце прыналежнасці да пэўнай групы і гонар, які зыходзіць ад гэтай прыналежнасці"[6]. Сам тэрмін "этнацэнтрызм" быў вылучаны ў пачатку XX стагоддзя амерыканскім вучоным Сэмнерам. Этнацэнтрызм узнікае ў выніку працяглай гістарычнай ізаляцыі чалавечых груп, культурна-бытавых адрозненняў паміж імі, у некаторых выпадках — нераўнапраўных адносін паміж групамі. Ён звязаны з рознымі тэмпамі развіцця этнічных супольнасцей, з розным узроўнем іхняга матэрыяльнага і культурнага прагрэсу. З сацыяльна-псіхалагічнага боку этнацэнтрызм узнікае як рэакцыя ў выпадку, калі чалавек у працэсе міжплемянной камунікацыі сутыкаецца з моўным і культурным бар'ерам. У выніку этнацэнтрызм узнікае пры сутыкненні з этнічным бар'ерам і замацоўвае яго. Этнацэнтрызм павышае ступень усведамлення этнічнай групы як асобнай нацыі, выклікае цікавасць да роднай гісторыі і культуры. Але пры наданні этнацэнтрызму павышанага значэння ён можа прывесці да непрымання іншых нацый і, магчыма, да ўзаемнага супрацьстаяння.

Этнас уяўляе сабой вынік сістэмы міжэтнічнага ўзаемадзеяння. Этнічнасць з'яўляецца сродкам самавызначэння. Сёння яна звязана са спробай прадухіліць стандартызацыю жыцця і уніфікацыю культуры, якія з'явіліся вынікам навукова-тэхнічнага развіцця. Этнічныя асаблівасці ладу жыцця народаў свету захоўваюцца ў дастатковай ступені, але сувязі паміж этнасамі і краінамі паступова набываюць сусветны характар.

Захоўваючы традыцыйныя рысы, культура і побыт народа паступова мяняюцца. У апошнія гады ўсё больш увагі надаецца этналагічнаму вывучэнню сучаснасці. Экспанаванне сучаснага побыту і культуры краіны, рэгіёна, асобных этнічных груп дазваляе паказаць дасягненні матэрыяльнага і духоўнага развіцця, мае выхаваўчае значэнне. Музеі, якія маюць помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, садзейнічаюць узнікненню цікавасці да вывучэння народнай спадчыны. Разам з тым неабходна заўважыць, што не ўсе з'явы жыцця знаходзяць сваё матэрыяльнае ўвасабленне. Напрыклад, змена характару працэсу працы, традыцыі калектывізму і ўзаемадапамогі могуць быць адлюстраваны толькі апасродкавана, з дапамогай фотаздымкаў альбо дакументаў.

Асобна вылучаецца праблема этналагічнага вывучэння сучаснасці. Яшчэ не знойдзены канкрэтныя шляхі вырашэння гэтай задачы. Даследчыкі па-рознаму падыходзяць да вывучэння данай праблемы. Адны лічаць, што ў працэс даследавання сучаснасці трэба ўключаць усе бакі жыцця сучаснага насельніцтва, усе бакі яго культуры. Другія мяркуюць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што трэба абмежавацца даследаваннем ролі і лёсу этнічных, нацыянальных рыс культуры кожнага народу. Распрацоўка адзінага метаду вывучэння сучаснасці ўскладняецца з-за шматграннасці (шматбаковасці) сучаснага жыцця.

Этналогія як навука ўзнікла ў XIX стагоддзі і з таго часу прайшла пэўныя ступені ў сваім развіцці. У першай палове XIX стагоддзя публікацыя сабраных матэрыялаў аб побыце і культуры беларусаў абмяжоўвалася кароткімі этнаграфічнымі артыкуламі, у сярэдзіне і другой палове XIX стагоддзя ўжо з'яўляюцца фундаментальныя працы аб матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Шмат даследчыкаў займаліся этналагічным вывучэннем Беларусі. Сярод іх было нямала беларусаў. Адзін з іх — Павел Міхайлавіч Шпілеўскі. У 1845 годзе ён склаў слоўнік беларускай мовы, а ў 1846 годзе пачаў друкаваць даследаванне "Беларускія народныя павер'і". Пазней, пасля экспедыцыі па Беларусі, выдаў працу "Падарожжа па Палессі і Беларускаму краю", дзе змясціў даволі багаты матэрыял па матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Праца Шпілеўскага "Падарожжа па Палессі і Беларускаму краю" займае адно з пачэсных месц у этналагічнай навуцы і вартая ўвагі.

Другі вядомы беларускі даследчык-этнограф — Адам Кіркор. Яго асноўныя працы змешчаны ў выданні "Живописная Россия". Кіркор асобна вылучыў этнаграфічны рэгіён — Палессе. Апісаў прыроду гэтага краю, даў характарыстыку адзення, прылад працы, асноўных заняткаў, звычаяў, абрадаў і павер'яў палешукоў. Спыніў увагу на анекдоце, які бытаваў сярод палешукоў у XIX стагоддзі. "Калі палешука спыталі, што ён за чалавек, ён, не задумваючыся, адказаў, што ён не чалавек, а пінчук"[7]. Гэты анекдот падкрэслівае асаблівасць духоўнай культуры палешукоў як асобнай этнаграфічнай групы.

Этналагічным даследаваннем Беларусі займаўся і Зарыян Даленга-Хадакоўскі. Ён адзін з першых паставіў задачу шырокага выкарыстання этнаграфічцага і фальклорнага матэрыялу пры вывучэнні агульнаславянскіх каранёў культурнай спадчыны славянскіх народаў. Сцвярджаў неабходнасць вывучэння фальклорнай і этнаграфічнай спадчыны ўсіх славянскіх народаў. Лічыў, што старажытныя ўяўленні больш за ўсё захаваліся ў беларускіх песнях і абрадах. Сабраў шмат песень, загадак, міфаў.

Вядомы збіральнік і даследчык народнай творчасці Вуйціцкі сабраў багаты матэрыял па Палессі. Як і Даленга-Хадакоўскі, ён лічыў, што "абрадавая паэзія ў параўнанні з іншай найбольш захавала свой першапачатковы выгляд"[8]. Вялікую ўвагу ён надаваў песням, у якіх прысутнічаюць старажытныя славянскія элементы. Займаўся апрацоўкай казак розных славянскіх народаў. Вуйціцкі быў першым збіральнікам беларускіх казак. Паказаў прыгажосць народнай казкі. Этналагічным вывучэннем Беларусі ў XIX стагоддзі займаліся і Эрэміч, Доўнар-Запольскі, Тур, Юхневіч, Васільева, Булгакоўскі, а таксама польскія даследчыкі: Зянькевіч, Крашэўскі, Кольберг і інш.

У пачатку XX стагоддзя пад уплывам ажыўлення грамадска-палітычнага і нацыянальнага руху ўзмацнілася дзеннасць па этналагічным вывучэнні Беларусі. Асабліва актыўна працягвалася збіральніцкая работа. Вывучэнне побыту і культуры беларусаў набыло больш мэтанакіраваны характар. Яно праходзіла пад кіраўніцтвам навуковых устаноў і самадзейных краязнаўчых арганізацый. Разам з вядомымі беларускімі даследчыкамі Е. Р. Раманавым, Я. Ф. Карскім, М. Я. Нікіфароўскім, М. В. Доўнар-Запольскім, М. А. Янчуком, У. М. Дабра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вольскім і інш., дзейнасць якіх разгарнулася яшчэ ў XIX стагоддзі, з'яўляюцца маладыя вучоныя і краязнаўцы А. К. Сержпутоўскі, І. А. Сербаў і інш., якія ўнеслі значны ўклад у далейшае этналагічнае вывучэнне Беларусі.

Этналагічным вывучэннем Беларусі ў XIX—XX стагоддзях займаліся рускія, польскія і беларускія даследчыкі, а таксама расійскія і польскія навуковыя і літаратурныя таварыствы. У 1957 годзе ў Беларусі ўзнік Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, што з'явілася значным крокам у развіцці этналогіі як навукі. Пазней у гэтай установе быў створаны Музей старажытнабеларускай культуры, які, сярод іншых, і па сённяшні дзень адыгрывае пэўную ролю ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. Выхаванню нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва садзейнічаюць і некаторыя друкаваныя выданні: энцыклапедыя "Этнаграфія Беларусі", "Этнография Белоруссии" М. Ф. Піліпенкі, шматтомнік "Беларусы" (на сённяшні дзень выйшла 4 тамы гэтага выдання), "Мова і этнічная самасвядомасць" Т. М. Мікуліч, "Падарожжа па Палессі і Беларускаму краю" П. М. Шпілеўскага і інш.

Звяртаючыся да народа, яго побыту і культуры, даследчыкі сталі больш глыбока вывучаць народнае жыццё. Гэта адыгрывала вялікае значэнне ў развіцці і станаўленні беларускай этналагічнай навукі. У сваю чаргу, этналагічная навука аказвала дабратворны ўплыў на культурнае жыццё Беларусі, садзейнічала развіццю беларускай інтэлігенцыі і спрыяла росту нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Такім чынам, вырашэнне праблемы гуманітарызацыі адукацыі ў пэўнай ступені вырашае праблему гуманізацыі грамадства.

---

[1] *Мікуліч Т. М.* Мова і этнічная самасвядомасць. Мн., 1996. С. 120.

[2] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Бялявіна, Г. І. Каспяровіч і інш. Мн., 2001. С. 406—407.

[3] *Пилипенко М. Ф.* Этнография Белоруссии. Мн., 1981. С. 8.

[4] Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 548.

[5] *Мікуліч Т. М.* Мова і этнічная самасвядомасць. С. 144.

[6] Актуальные проблемы этнографии и современная зарубежная наука. Л., 1979. С. 12.

[7] Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринтное воспроизведение изд. 1882 г. Мн., 1993. С. 345.

[8] *Бандарчык В. К., Малаш Л. А.* Беларуская этнаграфія і фальклор у працах славянскіх вучоных эпохі рамантызму. Мн., 1973. С. 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ